**НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ**
**АДДЗЯЛЕННЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ**
**ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ**

**ЗАПРАШАЕ**
**прыняць удзел у**
***Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі***

# ВЫНІКІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 2019 ГОДЗЕ

**Асноўныя напрамкі працы канферэнцыі:**
1) археалагічныя даследаванні помнікаў першабытнай эпохі;
2) археалагічныя даследаванні помнікаў сярэдневякоўя і новага часу;
3) ахоўныя мерапрыемствы ў зонах новабудоўляў і інвентарызацыя помнікаў археалогіі.

**Тэрмін правядзення канферэнцыі:** ***13–15 мая 2020 г.***

**Месца правядзення канферэнцыі: г. Мінск,** Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Пасяджэнні (пленарнае, пачатак у 10.00) – **13 мая 2020 г.,** (секцыйныя і падвядзенне вынікаў) **-14 – 15 мая 2020 г.**

13 мая 2020 г. – экскурсія па помніках археалогіі (г. Лагойск). Выезд з г. Мінска – 13.00 – вяртанне – 20.00.

**Рэгламент:** выступленні на пленарным пасяджэнні да 20 хвілін, на секцыях – да 15 хвілін.

**Працоўныя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, англійская.

**Тэрмін падачы заяўкі ў аргкамітэт:** ***да 15 красавіка 2020 г.*** У заяўцы на ўдзел у канферэнцыі паведамляецца назва даклада, прозвішча, імя, імя па бацьку, вучоная ступень, званне, месца працы, працоўны тэлефон, хатні адрас, хатні тэлефон, e-mail.

**Матэрыялы канферэнцыі** будуць апублікаваныя. Электронны варыянт артыкула памерам да 0,5 д.а. разам з ілюстрацыямі (тэкст не больш 20 тыс. знакаў, рэзюмэ на рускай, беларускай і англійскай мовах, УДК, ілюстрацыі, падрыхтаваныя ў фармаце tif, якасць не менш 300 dpi) і яго раздрукаваны варыянт перадаюцца ў аргкамітэт на канферэнцыі. Літаратура прыводзіцца ў канцы артыкула. Спасылкі ў тэксце змяшчаюцца ў квадратныя дужкі, напрыклад: [1, с. 12] ці [2]. Афармленне літаратуры згодна патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для ўдзелу ў канферэнцыі і артыкулаў для публікавання.

Аплата праезду, харчаванне і пражыванне за кошт камандзіруючых арганізацый.

**Кантакты:** 220072 г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Цэнтр археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі. Тэл./факс: (017) 284-18-70; Ляўко В.М. – (017) 284-28-54, onlevko@gmail.com; Вайцяховіч А.В. (017) 294-90-93, Voitehowich@tut.by; Кошман В.І. (017) 284-05-13, vadzim_archeo@tut.by; Юрэцкі С.С. (017) 284-13-22, stanislau.yuretski@gmail.com

**Аргкамітэт канферэнцыі**